# ДОЎГІ ШЛЯХ ЦУДАДЗЕЙНАГА ЛОТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэта выклікала пэўны ажыятаж, — успамінае настаяцель. — Мы пачалі шукаць любыя спосабы, каб не ўпусціць гэту ікону. Аператыўна адправіліся ў Германію, у горад Патсдам. І дзякуй богу, нам удалося яе набыць.

Ікона датуецца пачаткам ХХ стагоддзя. На зваротным баку захаваўся чарнільны надпіс: «Сей образ написан в лаврской иконописной иеромонахом Григорием». А на той час былі вядомы чатыры лаўры — пад Масквой, у Санкт-Пецярбургу, Кіеве і Пачаеве. У якой з іх пісалася ікона — невядома. Але ў Гродне не губляюць надзею «раскруціць» гэту гісторыю. Па ўсіх адрасах накіраваны запыты з просьбай знайсці ў архівах таго самага іканапісца Рыгора, які мог быць аўтарам іконы.

— Для нас вельмі важны сам факт знаходжання гэтага спіса Каложскай іконы Божай Маці, — кажа настаяцель царквы. — Ён створаны ў той час, калі яшчэ не быў страчаны сам арыгінал. Як кажуць аб важным малюнку? Што гэта прыжыццёвы партрэт. Так і тут. У гэтым і ёсць каштоўнасць абраза. Гэта адзіны на сённяшні дзень вядомы нам гістарычны спіс цудадзейнай іконы.


Фота БелТА.

**Протаіерэй Аляксандр БАЛОННІКАЎ са спіскам Каложскай іконы Божай Маці.**

### Што стала з самой старажытнай іконай?

З'явілася яна ў царкве ці то ў XVI, ці то ў XVII стагоддзі. Даныя наконт гэтага разыходзяцца. Згодна з паданнем, прынёс яе ў храм нейкі юродзівы жабрак, які насіў ікону на сабе, паколькі яе памеры невялікія — 18х24 см. Да жабрака людзі адносіліся з павагай, асабліва прыхаджане Каложы. Прадчуваючы свой скон, ён пакінуў ікону ў храме. Тут яна знаходзілася да 1853 года, калі ў выніку паводкі абрынулася сцяна Каложы. Потым яе перанеслі ў толькі што пабудаваны Свята-Пакроўскі сабор. Каложская ікона Божай Маці лічылася галоўнай святыняй Гродзенскай епархіі і ахоўнічай горада.

Кажуць, што ікона дапамагла адвесці ад Гродна кайзераўскіх салдат летам 1914 года. Як пісаў у той час у «Гродненских епархиальных ведомостях» палкавы святар, вестка аб пачатку Першай сусветнай вайны выклікала ў горадзе паніку. Крэпасць яшчэ не паспелі дабудаваць, фарты стаялі без гарматы. Жах апанаваў жыхароў і ваенных, бо яны ўжо бачылі каскі кайзераўскіх салдат.

— Гродзенскі архіепіскап Міхаіл выйшаў на цэнтральную плошчу з Каложскай іконай Божай Маці і стаў служыць малебен. Сабраўся ўвесь горад, людзі плакалі і маліліся. І ў гэты вечар войска Вільгельма павярнула ўбок ад Гродна. Горад атрымаў перадышку на год і мог падрыхтавацца да вайны. Гэта сапраўдная гісторыя і адно з вялікіх цудаў, — перадаў сэнс той публікацыі настаяцель Каложы.

З пачаткам ваенных дзеянняў ікону разам з архівам і іншымі гістарычнымі і культурнымі каштоўнасцямі перавезлі ўглыб Расіі. Яна захоўвалася, па адной з версій, у падмаскоўным манастыры, па другой — у падвалах сабора Васілія Блажэннага ў Маскве. Так ці інакш, але ў віхуры ваенных, а затым рэвалюцыйных падзей след цудадзейнай святыні згубіўся. Пошукі не далі ніякіх вынікаў. Арыгінал бясследна знік.

— Да гэтай пары мы не ведалі, што ёсць гістарычны спіс іконы, — расказвае Аляксандр Балоннікаў. — Абраз, які знаходзіўся ў Каложы, напісаны ў 2004 годзе. Цяпер мы вярнулі і гістарычную копію.

На думку настаяцеля, ікона, якая куплена на аўкцыёне, магла належаць расійскаму імператару. Адразу пасля памятнага малебна на плошчы, калі немцкія войскі павярнулі ўбок ад Гродна, у горад прыехаў Мікалай II з жонкай і дзвюма дочкамі. Яны наведалі кафедральны сабор, дзе знаходзіцца цудадзейная ікона, а на памяць архіепіскап падараваў царскай сям'і копію цудадзейнага абраза. Вядома, што для важных падзей і высокіх асоб іконы пісалі прызнаныя іканапісцы ў буйных манастырах. Каложская ікона, што прыбыла з Германіі, якраз і напісана ў адной з такіх лаўраў.

### Святыні пад шклом і на алтары

Каложская ікона прайшла рэстаўрацыю і ў хуткім часе будзе даступна для агляду. Яе памесцяць на ківот з дубу з браніраваным шклом. Урачыстае богаслужэнне ў гонар святыні пройдзе 1 мая. Магчыма, гэты дзень стане храмавым святам Каложскай царквы.

Дарэчы, з'яўленню святыні папярэднічалі яшчэ дзве важныя знаходкі. У запасніках кафедральнага Пакроўскага сабора адшукаліся высокія нестандартныя іконы. Аказалася, што яны напісаны епіскапам Іосіфам для Каложы яшчэ ў 1897 годзе і прызначаліся для вокнаў на рэштках храма. У той час узвялася драўляная сцяна замест знесенай патопам. Зараз іконы размешчаны на алтары.

— Гэта іконы, якія былі напісаны для храма пасля яго аднаўлення ў XIX стагоддзі, — кажа Аляксандр Балоннікаў. — І зараз яны на сваіх гістарычных месцах. Важна, каб святыні вярталіся.

Нядаўна Каложа прайшла новы этап аднаўлення. Унутранае памяшканне павялічылася за кошт узвядзення гістарычнай сцяны, яна цяпер выглядае па-іншаму і гармануе з каменнай часткай. На падлозе з'явілася шкляная вітрына, пад якой — рэшткі старажытнай калоны XII стагоддзя. Некалі іх было шэсць, зараз засталася толькі адна.

Наступны важны этап — стварэнне ўмоў для захавання аднаго з самых старажытных у Беларусі гістарычных помнікаў.

— Паколькі зімы ў нас нестабільныя, перапады тэмпературы адчувальныя, гэта негатыўна ўплывае на плінфу. Таму на сценах, у тым ліку знутры, устаноўлены датчыкі, якія ўвесь час маніторацьць вільготнасць і тэмпературу, — паведаміў настаяцель. — На аснове даных навукоўцамі будзе зроблена заключэнне, як захаваць помнік манументальнай архітэктуры. І мы, безумоўна, скарыстаемся іх парадамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# РАМАН З ПРАЦЯГАМ

## Гісторыя беларускай эстрады — вачыма яе стваральніка

**У расійскім выдавецтве «Кабінетны вучоны» (Масква — Екацярынбург) пабачыла свет адметная для беларускай культуры кніга. Яе аўтар — заслужаны артыст БССР Уладзіслаў Місевіч.**

«Песняры»: Я раман з прадаўжэннем пішу...» — такая назва ў ёмістага фаліянта, які не проста ўзнаўляе падзеі музычнага, культурнага жыцця ў Беларусі на фоне гісторыі славутага ВІА «Песняры», а паказвае ўсю глыбіню лёсаў самых «песняроў». Найперш — народнага артыста Савецкага Саюза Уладзіміра Мулявіна. І робіць гэта аўтар нязмушана, спакойна, ды піша аб усім адкрыта і шчыра. Пры гэтым захоўвае высокі такт і вялікую павагу ў дачыненні да свайго сябра — вялікага музыканта сучаснасці Уладзіміра Георгіевіча Мулявіна і іншых паплечнікаў па лёсе «Песняроў».

Легендарны ансамбль — унікальная старонка ў гісторыі савецкай і беларускай эстрады. Разам з Уладзіславам Місевічам чытач мае магчымасць пабываць у розных куточках постсавецкай прасторы, у краінах Азіі, Амерыкі, Афрыкі. У кнізе — уражанні, якія прывезены з Германіі і ЗША, Буркіна-Фасо і Індыі, шмат якіх іншых куточкаў свету. На старонках выдання нас чакаюць сустрэчы з Мікалаем Дабрарнавым і Аляксандрай Пахмутавай, Іосіфам Кабзонам і Эдуардам Ханком, Віктарам Вуячычам і Алай Пугачовай, Андрэем Вазнясенскім і Рыгорам Барадуліным...

Старонкі ўспамінаў (між іншым, уражвае літаратурнае, публіцыстычнае майстэрства Уладзіслава Місевіча — распавед выкладзены ярка, піша аўтар рэльефна, так, што адразу становішся непрыкметным дзейсным сведкам далёкіх падзей) адкрываюць гісторыю стварэння многіх песень, асобных праграм, якія прагучалі ў выкананні «Песняроў». Праз ёмістыя характарыстыкі і лаканічна выкладзеныя эпізоды Уладзіслаў Людвігавіч паказвае, з якім піетэтам Уладзімір Георгіевіч Мулявін ставіўся да беларускай паэзіі, да літаратурных тэкстаў увогуле. Таму на старонках кнігі і згадваюцца імёны народных песняроў Беларусі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова...




Праз многія раздзелы кнігі праходзіць імя народнага артыста СССР кампазітара Ігара Лучанка, быў цесна звязаны з лёсам ансамбля «Песняроў», які пісаў музыку да тых песень, што дзякуючы «Песнярам» сталі не проста хітамі, а яшчэ і сімвалам Беларусі. Варта згадаць хоць бы адну толькі «Александрыну»!..

«Песняры»: Я раман з прадаўжэннем пішу...» — сапраўдная споведзь пра сябе і час. Уладзіслаў Місевіч праявіўся ва ўспамінах чалавекам таленавітым і ў літаратурнай справе. Сапраўды, патрэбен працяг, патрэбен яшчэ болей шырокі распавед пра беларускую эстраду вуснамі аднаго з яркіх яе стваральнікаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

УТВЕРЖДЕНО
Решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс»
_____________ 2019 г. № ___

ИЗМЕНЕНИЯ
в Проспект эмиссии облигаций первого выпуска Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс», утвержденный решением единственного участника Общества с дополнительной ответственностью «ТУТ и ТАМ Логистикс» от 6 августа 2018 г. № 02

Пункт 1.4 изложить в следующей редакции:

«1.4. Номера текущих (расчетных) банковских счетов, на которые будут зачисляться средства, поступающие при размещении облигаций, наименование обслуживающего банка

Денежные средства, поступающие при размещении облигаций настоящего выпуска, будут зачисляться в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на текущие счета Эмитента:

BY89MTBK30120001084000090295 (USD) в Закрытом акционерном обществе «Минский транзитный банк», БИК MTBKBY22;

BY32MTBK30120001093300071663 (BYN) в Закрытом акционерном обществе «Минский транзитный банк», БИК MTBKBY22.».

2. В пункте 2.12 после части пятой дополнить пункт частью следующего содержания:

«В случае размещения Облигаций в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в белорусских рублях расчет стоимости Облигации осуществляется по каждой Облигации по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату совершения сделки с округлением полученных значений в соответствии с правилами математического округления с точностью до целой белорусской копейки.».

Генеральный директор
Общества с дополнительной ответственностью
«ТУТ и ТАМ Логистикс» О. М. Маргун

Главный бухгалтер
Общества с дополнительной ответственностью
«ТУТ и ТАМ Логистикс» О. В. Будай
УНП 100599687

**Ликвидационная комиссия
РУПП «Гроднотекстиль» объявляет о проведении
повторного аукциона по продаже имущества**

| № п/п | Наименование имущества | Стоимость с НДС | Сумма задатка 10 % |
|---|---|---|---|
| № 1 | Водопроводная сеть, 22,24 м, инвентарный № 400/С-72656 (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 33,00 | 3,30 |
| | Канализационная сеть, 129,1 м, инвентарный № 400/С-72659 (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 96,28 | 9,63 |
| № 2 | Кабельная линия 0,4 кВт, 83,5 м, инвентарный № 400/С-72680 (сооружение специализированное энергетики) | 13,82 | 6,91 |

Имущество находится по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Богуцкого, 8. Торги состоятся 19 марта 2019 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 121. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

– копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гроднотекстиль» № BY32BLBB30120500048503001001 БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк» г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка по каждому лоту;

– копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены до 15.00 14 марта 2019 года. Победитель аукциона возмещает затраты по организации и проведению аукциона. Телефон для справок (8-152) 43-99-64

**Извещение о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. Размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221586000601000081, площадью 0,2434 га по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Псуевский с/с, д. Бобруйщина, ул. Озерная, 6Ж, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Белое-5, оз. Окунево-3). Нач. цена: 613,37 бел. руб. Задаток: 61,34 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: 15.04.2019 в 14.15 по адресу: Витебская обл., г. Глубокое, ул. Ленина, 42, в Глубокском райисполкоме. Срок внесения задатка и приема документов: с 14.03.2019 по 12.04.2019 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Реквизиты для внесения задатка: р/с BY15AKBB36003151165220000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Псуевский сельсовет). Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь) |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 раб. дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за земельный участок в частную собственность; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формирования земельного участка, гос. регистрации создания этого участка; осуществить в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона гос. регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок. При невыполнении данного требования, решение считается утратившим силу; получить в установленном порядке проектную документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее одного года после гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления; после получения разрешения на строительство одноквартирного жилого дома снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства участка. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.